# ВОДГУК

на аўтарэферат дысертацыі
**Канстанцінавай Таццяны Леанідаўны**

## «АБХОДНЫЯ ПЕСЕННА-ВІНШАВАЛЬНЫЯ ТРАДЫЦЫІ Ў КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВЫМ ЦЫКЛЕ ПАЎНОЧНАЙ БЕЛАРУСІ»,

прадстаўленай на суісканне вучонай ступені кандыдата мастацтвазнаўства па спецыяльнасці 17.00.02 – музычнае мастацтва

Тэма дысертацыі Канстанцінава Т. Л. адпавядае спецыяльнасці, па якой яна прадстаўлена да абароны – 17.00.02 – музычнае мастацтва. Аўтарэферат дысертацыі сведчыць аб суаднясенні яе зместу з праблемным полям мастацтвазнаўчай навукі.

Даследчыца сканцантравала сваю ўвагу на музычных традыцыях у вельмі складаным рэгіёне, размешчаным на перасячэнні некалькіх культурных уплываў – славянскага, балцкага і фіна-угорскага. Аб'ектам даследавання з'яўляюцца абходы ў каляндарна-песеннай традыцыі Паўночнай Беларусі. Актуальнасць тэмы абумоўлена неабходнасцю распрацоўкі як тэарэтычных (недастаткова акрэслена паняцце *абход*), так і практычных (рэгіянальны кантэкст) аспектаў.

Аўтар дасягнуў мэты даследавання, прадставіў добра абгрунтаваную сістэму ўяўленняў аб музычным кампаненце ў абходах у каляндарна-абрадавым цыкле Паўночнай Беларусі, іх функцыях, спецыфіцы, тыпалогіі.

Дасягнутыя Т. Л. Канстанцінавай вынікі былі прадстаўлены на 30 навуковых канферэнцыях; атрыманы 5 актаў укаранення ў дзейнасць устаноў адукацыі і бібліятэк; надрукавана 39 публікацый, у тым ліку 4 раздзела ў манаграфіях, 14 артыкулаў у часопісах і зборніках са спіса рэкамендаваных ВАК Беларусі, 4 артыкула ў навуковых зборніках і часопісах, 1 артыкул у энцыклапедыі, 8 матэрыялаў канферэнцый і іншыя публікацыі.

Дысертацыя Т. Л. Канстанцінавай з'яўляецца самастойным завершаным навуковай працай, змяшчае важныя высновы, на базе якіх могуць

працягвацца даследаванні ў галіне этнамузыкалогіі. Згаданая дысертацыя адпавядае ўсім патрабаванням, а яе аўтар заслугоўвае прысваення ступені кандыдата мастацтвазнаўства па спецыяльнасці 17.00.02 – музычнае мастацтва.

Выказваю сваю згоду на размяшчэнне водгуку на сайце УА «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі».

доктар мастацтвазнаўства, В. М.Папко
кандыдат гістарычных навук,
дырэктар ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі»

Подпись О.Н. Папко
УДОСТОВЕРЯЮ
Ведущий специалист по кадрам
О.Н. Новикова
«20» 11 2025 г.